УДК 811.161.3’373.45

Студ. Д.А. Зайцаў, Ц.Дз. Рэўт
Навук. кір. ст.выкл Т.П. Гуліцкая
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

# ЗАПАЗЫЧАННІ З АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ Ў ВЫДАВЕЦКАЙ ЛЕКСІЦЫ

У апошні час можна назіраць павелічэнне ўжывання ў мове англіцызмаў – словаў, запазычаных з англійскай мовы. Шырокае ўкараненне ІТ-тэхналогій, глабалізацыя інфармацыйнай прасторы, новыя падыходы ў выдавецкай справе не абышлі працэсы запазычвання лексікі, у першую чаргу англійскай, у гэтай галіне [1], [2]. Запазычаныя словы могуць адаптавацца ў беларускай мове рознымі спосабамі. Часцей за ўсё адбываецца працэс транскрыпцыі ці транслітэрацыі: *monitoring – маніторынг (назіранне), advertising – адвертайзінг (рэкламаванне, рэклама; арганізацыя і працэс інфармавання аб таварах і паслугах), community – кам’юніці (аб’яднанне людзей, якія маюць агульныя інтарэсы і маюць зносіны найперш праз сетку інтэрнэт), non-fiction – нон-фікшн (біяграфічны публіцыстычны твор, дакументальная літаратура).*

Часта сустракаецца запазычванне некалькіх паняццяў з аднолькавай часткай: *прэс-рэліз (англ. press release); прэс-тур (англ. press tour); прэс-цэнтр (англ. press center).* Акрамя таго, у апошні час можна сустрэць лексемы, якія праходзяць асіміляцыю і становяцца агульнапрызнанымі пры абсалютнай транслітэрацыі (*паблік рылейшнз* ці яго абрэвіяцыю і ўтворныя ад яго словы ў абодвух варынтах: *піяр-менеджар – PR-менеджар).* Некаторыя запазычаныя словы падпарадкавацца граматычным правілам беларускай мовы, утвараючы новыя: *ксеракс – ксеракопія – ксеракапіраваць – ксеракапіраванне.*

Такім чынам, запазычанне лексікі англійскай мовы стала актыўным ў апошнія гады, англіцызмы можна сустрэць абсалютна ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека, у тым ліку ў лексіцы выдавецкай справы, што абумоўлена актыўным развіццем інфармацыйных і тэхналагічных працэсаў у гэтай галіне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Слоўнік выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў: анг.-бел., бел ,-анг. / Уклад. К.Санько; Навук. рэд. А.Зьмітровіч. – Мн.: Тэхналогія, 2003. – 93 с.

2. Уласевіч, В. І. Слоўнік новых запазычаных слоў беларускай мовы / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : Беларусь, 2023. – 175 с.